Віктар
Швед

# Мая зялёная Зубровія

KAMUNIKAT.org

KAMUNIKAT.org

**Віктар**
**Швед**

# Мая зялёная Зубровія

ВЕРШЫ

МІНСК

,,МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА”

1990

KAMUNIKAT.org

ББК 84.4 Пол
Ш 34

Укладанне і прадмова *Яўгена Міклашэўскага*

Виктор Швед живёт в Польше, пишет по-белорусски.
В своих произведениях он прославляет родной уголок - деревню Мора на Белостотчине, её трудолюбивых людей.
Есть в зборнике и стихотворения, посвяшченные Советской Белорусии, а также стихи не исторические темы.

ISBN 5-340-00478-3

© Выдавецтва
,,Мастацкая літаратура”
1990

KAMUNIKAT.org

*МАЛЕНЬКАЯ АЙЧЫНА*

У другой палове пяцідзесятых гадоў адначасова з Беларускім грамадска-культурным таварыствам (БГКТ), друкаваным органам якога стала „Ніва”, у Народнай Польшчы ўзнік і беларускі літаратурны рух, які паступова (а да якога далучыліся і мастакі) аформіўся як Беларускае літаратурна-мастацкае аб’яднанне ,,Белавежа”.

Адным з пачынальнікаў і самых актыўных удзельнікаў гэтага руху з’яўляецца паэт Віктар Швед – аўтар дзвюх кніжак вершаў, выдадзеных у Беластоку, і кніжкі паэзіі для дзяцей ,,Дружба”, якая выйшла ў Мінску (1976).

Віктар Швед нарадзіўся 23 сакавіка 1925 года ў ыёсцы Мора Беластоцкага ваяводства. Скончыў Беларускі ліцэй у Бельску Падляшскім, Акадэмію палітычных навук у Варшаве, аддзяленне журналістыкі і беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта.

Працаваў у выдавецтве ,,Ксёнжка і ведза”.

,,Мая зялёная Зубровія” – своеасаблівае ,,Выбранае”, вынік шматгадовай працы паэта.

Віктар Швед – паэт традыцыйны, з адметным паэтычным голасам і сваёй тэмай – вялікай тэмай маленькай Айчыны. Непаўторнасць яго паэзіі – у грамадзянскай пафаснасці, шчырасці і праўдзе чалавечых перажыванняў:

У маіх вершах – сэрца насцеж,
Праўдзівасць пройдзенага, дум.
У маіх вершах – маё шчасце
І ў перамежку боль і сум.
……………………………………
У мае вершы пераліта,
Як кроў у вены, пачуццё.
Усё, што мною пražыта, -
Усё – усё маё жыццё.

У сваіх – эмацыянальна яркіх – вершах, як на каляровых фотаздымках, паэт увекавечыў шматграннае жыццё маленькай айчыны з яе прадвечным сялянскім побытам, працай і штодзённым клопатам бацькоў, іх звычаямі і абрадамі.

Паэзія Віктара Шведа прасякнута нейкім шчымлівым сумам, непрыхаваннай горыччу і болем, шкадаваннем страчанага – таго, што няўмольна і беззваротна адыходзіць у мінулае, што стала чалавеку дарагім і блізкім на ўсё жыццё. Імклівы і бяздумны час эпохі НТР нясе на сваіх бліскучых лёгкіх крылах непазбежныя змены, якія паэт безупынку назірае і ў вясковым побыце і ў жыцці наогул,

І гэта звязана не толькі з адыходам ранейшага укладу жыцця, але і з атрыбутамі той маральнай дэградацыі, якая робіцца жыццёвай нормай сучаснага грамадства: адмаўленне ад непарушных каліcьці традыцыі і этнасу, пагарда да ўсяго свайго, роднага, што на працягу некалькіх стагоддзяў перадавалася з пакалення ў пакаленне, ад бацькоў да дзяцей, і - –самая вялікая бяда – адмаўленне ад роднай мовы, найкаштоўнейшага багацця народа, нацыянальнай святыні:

Родная мова Купалы і Коласа,
Мусіш свае ты правы адстаяць,
Каб у журбе не гучаць напоўголаса -
Месца пачэснае ў свеце заняць.

Ёсць, можа, мовы яшчэ прыгажэйшыя,
Я ж паўтараць безупынку гатоў:
Мне наймілейшая, найдаражэйшая,
Найпрыгажэйшая – мова бацькоў.

Тая ж усхваляванасць, эмацыянальная насычанасць уласціва і лірыцы кахання паэта, і пейзажным замалёўкам, і вершам, якія з'явіліся ў выніку „падарожжаў”.

Сярод іх ёсць прачулыя радкі, навеяныя наведваннем Беларусі ці прысвечаныя славутым сынам беларускага народа.

Нягледзячы на выключна нацыянальную тэматыку гэтай кнігі, на крыўду і горыч, выкліканыя працэсам асіміляцыі беларускага насельніцтва Беласточчыны, праз усю творчасць Віктара Шведа выразным лейтматывам праходзяць матывы інтэрнацыяналізму – шчырай павагі да іншых народаў, у прыватнасці, да польскага:

Прывабнасць кожнай кветкі-краскі
І сэрца кожнага раскоша
Ёсць у звароце
,,Калі ласка”
У польскай мове
„Bardzo proszę”.
…………………………………………
І беларусаў, і палякаў
Заўжды аднолькава хвалюе
Як дарагое слова
,,Дзякуй”
Так і чароўнае
,,Dziękuję”.

Яўген МІКЛАШЭЎСКІ

*МАЯ ЗЯЛЁНАЯ ЗУБРОВІЯ*

*Мая зялёная Зубровія*
*Ты ўжо стаяла над магілаю,*
*Цябе хаваць былі гатовыя,*
*А ты ўваскрэсла з новай сілаю.*

*І быццам Фенікс адрадзілася,*
*Квітнееш краскай васільковаю,*
*Ты сёння зноўку мне прыснілася*
*Мая зялёная Зубровія.*

*Я над адвечнаю Дубровая*
*Пачую зноў песні салаўіныя.*
*Мая айчынная Зубровія,*
*Цябе ўслаўляць хачу няспынна я.*

*Ты пакарай вяршыні новыя,*
*Ствара каштоўнасці багатыя.*
*Ты несмяротная, Зубровія,*
*Дык будзь шчаслівай і крылатаю.*

# 1

-------

KAMUNIKAT.org

*БЕЛАРУСЬ*

І зноў знаёмыя мясціны -
Лясы, пасёлкі, гарады.
О, Беларусь, ты край гасцінны,
Край жыватворны, малады.

Край з маляўнічаю прыродай,
Сваіх багаццяў уладар,
Край працавітага народа,
Край здзейсняных надзей і мар.

Хоць я цябе ізноў пакіну ў,
Хоць я сказаў табе: бывай!
Жывеш ты ў сэрцы, ва ўспамінах,
О, Беларусь, гасцінны край!

*МІНСК*

Праз многа год, вандрую я ізноў
Па гулкіх плошчах, вуліцах знаёмых.
І сустракаю шмат сваіх сяброў,
І адчуваю тут сябе, як дома.

І шчыры, нізкі аддаю паклон
Я неўміручым Коласу, Купалу,
Што па дарозе працавітых дзён
Спыніліся спачыць на п’едэсталах.

Цудоўны Мінск! Хоць і прайшлі гады,
Хоць я цябе даўным-даўно не бачыў,
Ты, як і быў, астаўся малады,
Я позірк твой захоўваю юначы.

Манету ў Свіслач кідаю знарок,
Як сімвал, што сюды яшчэ вярнуся,
Што будзе зноўку вабіць, цешыць зрок
Сталіца светлазорнай Беларусі.

KAMUNIKAT.org

*МАКСІМ БАГДАНОВІЧ*

Дзе Чарнамор’я пеністыя хвалі
Аб прыбярэжны дробяцца валун,
Там сумныя акорды прагучалі
З апошніх, абарваных лёсам струн.

І цудадзейная замоўкла ліра,
Замоўк хваробай скошаны пясняр.
І толькі ў песні маладой і шчырай.
Пульсуе думка, ззяюць промні мар.

У ёй жыве наш край гаротны, ціхі,
У спелым жыце васількі цвітуць,
І імі трызняць слуцкія ткачыхі,
Што паясы на лад персідскі ткуць.

KAMUNIKAT.org

*НА РАДЗІМЕ*
*ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА*

Ад берагоў шумлівай Віслы,
Ад вуліц Фенікса-Варшавы
Прыехаў я на рэчку Іслач –
На рэчку паэтычнай славы.

Над ёй шумяць таемна дрэвы,
Нібы аб чымсьці нам гавораць –
Аб тым, што Дунін-Марцінкевіч
Не мог няпраўду тут агораць.

Мінулы час уваскрашае
Людская памяць непрыкметна:
Дудар у Люцінцы спявае
Нам песні волі запаветнай.

*РАСКАЖЫ НАМ,*
*ЛЕС ДРЫМУЧЫ*

Раскажы нам, лес дрымучы,
Аб мінуўшчыне сівой.
Пазнавацьнас мала вучаць
Шлях гісторыі сваёй.
Мы пра то е знаем мала,
Як пад кронамі дубоў
Вояў некалі Ягайла
На Крыжакаў грозных вёў.
Лес дрымучы, раскажы нам
(Ці ж было ў нас мала спраў!),
Як першадрукар Скарына
З Вільні ў Кракаў вандраваў.
Раскажы нам, лес зялёны,
Як калісьці тут Кастусь,
Грозны ,,камісар чырвоны”
Ваяваў за Беларусь.
Раскажы нам, лес бывалы,
Як падчас ваенных год
З фашыстоўскаю навалай
Тут змагаўся наш народ.
Слаўны лесе, раскажы нам
Аб мінулым дарагім.
Мы з гісторыяй Айчыны
Незнаёмыя зусім.

## *КАСТУСЮ КАЛІНОЎСКАМУ*

*Будаўнікам Дома культуры*
*імя Кастуся Каліноўскага ў Гарадку*

З бацькоўскай вёскі Мастаўляны,
Мо і не раз праз Гарадок
Ішоў з наборам палымяным
,,Мужыцкай праўды” ў Беласток.

Складаў з вялікаю адвагай
Свае бунтоўныя радкі,
Распальваў сэрцы пад сярмягай –
Ішлі змагацца дзецюкі.

Ішлі на панскія палацы,
За пот, за голад, мазалі.
Сялянскай праўды дамагацца,
І вольнай працы і зямлі.

За незалежныя краіны,
За Польшчу і за Беларусь,
За родны свой народ загінуў
Ў лютай барацьбе Кастусь.

Аддаў жыццё за наша шчасце,
За волю, роўныя правы.
Адкрыты нашы сэрцы насцеж –
У іх Кастусь заўжды жывы.

## *АСІМІЛЯЦЫЯ*

Мы ад свайго ўцякаем і ўцякаем,
Здаецца нам, што ўсе мы з горшай гліны.
Хоць нас ніхто сілком не прымушае –
Мы мовы выракаемся, айчыны.

Хаця няма ніякага прымусу,
Хаця ў краіне лёс усіх аднакі,
Ніхто ўжо быць не хоча беларусам,
Сілком усе мы ціснемся ў палякі.

Імёны дзецям мы даём чужыя,
Сваіх, спрадвечных, родных нам, не цэнім.
І толькі прозвішчы пакуль яшчэ старыя,
Ды прыйдзе час – і прозвішчы мы зменім.

І з кожным днём усё нас меней, меней –
У польскім моры расстаём няспынна.
І будзе згодным з праўдаю сцвярджэнне,
Што Польшча аднародная краіна.

KAMUNIKAT.org

*ДРЭВА КРАІНЫ*

Расце няспынна
Дрэва краіны.
Адна галіна –
Białorusini.

Дрэва краіны,
Без перабою
Квітнець павінна
З кожнай вясною,

Каб зноў у восень
Усім у хаты
Маглю прыносіць
Свой плён багаты.

Калі ж галіна
На ім завяне –
Дрэва краіны
У хворым стане.

Таму, краіна,
І ў дні нягоды
Усе галіны
Шануй заўсёды.

KAMUNIKAT.org

*Я НАРАДЗІЎСЯ*
*БЕЛАРУСАМ*

Нарадзіўся
Беларусам.
Беларусам
Буду жыць!
Мову родную
Клянуся
Шанаваць,
Цаніць,
Любіць.
Сваю родную
Старонку
Я люблю,
Як і буцькоў,
Што вучылі
Песні звонкай,
Прывівалі
Мне любоў:
І да мовы,
Да дубровы,
Да палёў
І да лугоў
І заўсёды
Да народа,
Што жыве тут
Ад вякоў.

KAMUNIKAT.org

Я клянуся:
Не зракуся
Сваё роднае
Любіць.
Быў і буду
Беларусам,
Пакуль толькі
Буду жыць!

KAMUNIKAT.org

***

> Беларускія пісьменнікі
> не пішуць на-беларуску,
> а толькі на беларускай мове.
> *М.Багдановіч*

Праўду горкую, як свой пратэст,
Перадаў калісьці Багдановіч.
Ці ва ўсіх быў беларускі змест,
Хто пісаў на беларускай мове.
Як жа актуальна гэта ў нас,
Родныя кранаем справы слаба.
Мы сабе ў стракатасці прыкрас
У сусветным бачымся маштабе.
Верш сатканы з беларускіх слоў,
Родных спраў круг закранае вузкі.
У перакладзе на любую з моў
Гіне цалкам аўтар беларускі.
Не жывём у гушчы мы падзей,
Што праходзяць на вачах заўсёды.
Не жывём мы справамі людзей,
Мы ўжо адарваны ад народа.
Трэба нам да сэрца сёння ўзяць
Багдановіча Максіма словы:
Час па-беларуску нам пісаць,
Не адно – на беларускай мове.

*ПАМЯЦІ АЛЕСЯ ГАРУНА*

Ты мір і волю нёс айчыне,
Калі шалеў вайны віхор.
І нечакана на чужыне
Змаганнем змучаны памёр.

Гасцінны старажытны Кракаў
Прыняў цябе, паэт-змагар.
Ты спіш адзін сярод палякаў
З няздзейсненым цяжарам мар.

Магіла знойдзена ў стагоддзе
Прыходу ў неспакойны свет.
І жыць ты будзеш у народзе,
Ты несмяротны, наш паэт!

Ты з небыцця да нас вярнуўся,
Цяжкі твой і па смерці лёс.
Распяты ў роднай Беларусі,
Ты ўваскрасаеш, як Хрыстос.

KAMUNIKAT.org

*БЕЛАРУС*

Чалавек ён працавіты,
На палетку сее жыта,
Каб заўжды мець хлеба кус.
І не будзе век цурацца
Аніякай цяжкай працы
Працаздольны беларус.

І не гнецца, як пахілы,
І, калі хапае сілы,
Ёсць да хлеба сала брус.
Абыходзіць перашкоды
І жыцця свайго нягоды
Непакорны беларус.

Беларус у нашых сёлах
Знае песень шмат вясёлых,
І падкруціць толькі вус,
Возьме спрытную Антольку
І пачне круціць з ёй польку –
Вось які ён – беларус.

Завітаюць толькі госці,
І ў каморы знойдзе штосьці,
Сцеле на стале абрус –
Саматканы, вышываны,

І гасцей сваіх жаданых
Пачастуе беларус.

Як пачне тапіць нас вораг
У крыві людское моры –
Ён не ўтопіць наш хаўрус:
Хутка ўзяўшы ў рукі зброю,
Сваё роднае, святое
Абароніць беларус.

Калі нават мы часткова
Адмаўляемся ад мовы,
Хоць не існуе прымус,
Здраднікам скажу: паверце,
Не баіцца нават смерці
Працавіты беларус.

KAMUNIKAT.org

## *ЛЯЦІ, МАЯ ПЕСНЯ*

*Памяці*
*Міхася Забэйды-Суміцкага*

Чароўных гукаў родных слоў
Стрымаць не змогуць нават межы:
Яна вярнулася ізноў
З далёкай Прагі ў Белавежу.

Дзе толькі велічны, з агнём,
Плыў мілагучны голас звонкі,
Заўсёды разам з Міхасём
Спявала родная старонка.

Цурчаў лянiва ручаёк,
Аб нечым пушча гаманіла,
Граў на жалейцы пастушок,
Плыў шчэбет птушак лёгкакрылых.

Дык хай далей чулліва так
Старонку родную ўслаўляе
Заўсёды малады мастак
І песня, вечна маладая.

2

--------

KAMUNIKAT.org

*РОДНЫ КУТ*

У нябыт пайшлі нягоды
Шмат людскіх пакут.
Прыгажэе з кожным годам
Мілы, родны кут.

На палетках плён багаты,
Мора каласоў.
У лагчынах дрэмлюць хаты
Ў засені садоў.

З хат да працы рана, рана
Выйшаў мой народ.
Збожжа спелае сабрана –
Слаўны і ўмалот!

І заўсёды будзе блізкім,
Што спазнаў я тут.
Ты – жыццё маё, калыска,
Мілы, родны кут!

KAMUNIKAT.org

## *ДЗЯЦІНСТВА ПРЫСТАНЬ*

*Жыхарам вёскі Мора*

Майго дзяцінства прыстань – Мора,
Адкуль выводзіш свой назоў?
Відаць, было тут мора гора,
Сярод балот, сярод хмызоў.

Тут асушылі ўжо балота,
З балотам зніклі хмызнякі,
Знікаюць гора і турботы,
Жыць сталі лепей землякі.

Тады назоў мо недарэчны,
Мо жа інакш назваць сяло?
Не існаваць таму ўжо вечна,
Што век свой доўгі аджыло.

Ды не! Талковы і прыгожы
І новы мае сэнс назоў.
Шуміць навокал мора збожжа,
У моры квеценных садоў.

За Морам роўнядзь і прастора,
Не падуладныя вякам...
Жадаю я багацця мора
І мора шчасця землякам!

KAMUNIKAT.org

*БАЦЬКОЎСКІ ПАРОГ*

Куды б мяне лёс не закінуў
З далёкіх і блізкіх дарог,
Заўсёды знайду пуцявіну
На родны, бацькоўскі парог.

Знаёмае ўсё тут з маленства,
Прырода, усмешкі людзей,
Ды меней штораз падабенства
З усім, што было тут раней.

Дарогі, дарогі... і тыя
Змяняюцца ўжо на вачах.
Уздоўж іх слупы-вартавыя
Трымаюць драты на плячах.

Пабег па дратах, як па жылах,
Пад стрэхі вясковыя ток.
Дзе цьмяна капцілка свяціла,
Святло мігацела здалёк.

Чуваць гул матораў на нівах,
І песні гучаць ва ўнісон
Людзей працавітых, руплівых,
Што ў полі збіраюць свой плён.

О, колькі ж у вас прыгажосці
Палі з ураджаем, лугі,
Мясціны маёй маладосці,
Бацькоўскі парог дарагі.

KAMUNIKAT.org

*СЦЕЖКІ ЖЫЦЦЯ*

Ад шумлівай маёй Белавежы,
Ад хаціны сасновай бацькоў
Шмат прайшоў у жыцці сваім сцежак
І гатовы ў дарогу ізноў.

На складаных людскіх каляінах
Я шукаў цеплыні, дабраты,
І знайшоў іх у родных мясцінах,
Таму гэты кут мне святы.

А калі мае стомяцца ногі,
Я згару ад жыццёвых трывог,
Хай апошняя сцежка-дарога
Прывядзе на бацькоўскі парог.

## *ПАДЛЯШША*

Падляшша, роднае Падляшша,
Мая маленькая Айчына!
Гасцінная зямелька наша,
Прымі, прымі паклон ад сына.

Палі, лугі і пералескі
Ваш адчуваю свежы подых.
Святыня пушчы Белавежскай
Была падтрымкай мне заўсёды.

Гняце мяне бетонны горад
Сваім агромністым цяжарам,
Таму заўсёды вёска Мора
І ў снах маіх жыве, і ў марах.

Таму я сэрцам і душою
Імкнуся да цябе няспынна,
Маё Падляшша дарагое,
Мая маленькая Айчына.

KAMUNIKAT.org

## *МАЯ МАЛЕНЬКАЯ АЙЧЫНА*

Мая маленькая Айчына,
Мой беластоцкі родны край.
Тут басаною стаптаў сцяжыны,
Што праляглі праз поле, гай.

Цаніць тут навучыўся працу,
Гамонку шчырую, народ.
І не магу цябе я страціць,
Ты даражэйшая штогод.

Далёка ад цябе – сумую,
Убачу – дык шчаслівы зноў.
У сэрцы заўсягды нашу я
Крыніцу мар маіх і сноў.

Мая маленькая Айчына,
Я твой адданы верны сын.
Цябе ніколі не пакіну,
Мая калыска, мой спачын.

*МАЯ МОВА*

Цябе з калыскі, немаўлём,
Я атрымаў як запавет.
З табою ўрос у родны дом,
З табою пазнаваў я свет.

З табой жыве айчынны край
І працавіты мой народ.
Народзе, мовы не кідай,
Узбагачай яе штогод!

Крыніца думак, пачуцця,
Натхнення, дзе няма маны,
І спадарожніца жыцця
Мне ад калыскі да труны.

Калі ж у шчасці ці журбе,
З надзеяй, смуткам уваччу,
Я, мова, думаю ў табе,
Дык у табе я і маўчу.

KAMUNIKAT.org

*МАЯ ЗЯМЛЯ*

Я зросся з роднаю зямлёю,
Дзе блізкі мне жыве народ,
Яе пад босаю нагою
Я чую ад дзіцячых год.

Глыбока запусціў карэнні
Я ў родную сваю зямлю.
Тут сокам многіх пакаленняў
Сваю я смагу наталю.

Зямля дае натхненне, думы,
Бацькоўскай мовы прыгажосць
І сэрца напаўняе сумам,
Калі ты дома рэдкі госць.

Часцінка нашае планеты,
Далёка ты – а я ў журбе.
Жывеш, зямля, заўжды ўва мне ты,
Пакуль хаджу я па табе.

Мая зямля, мая калыска,
Прычал мой да апошніх дзён.
Ты ад душы прымі мой нізкі,
І шчыры, і зямны паклон!

*МОЙ НАРОД*

> Тады ў народа ёсць паэты,
> Калі ў паэтаў ёсць народ.
> *Р.Баравікова*

Калі я еду на Радзіму,
Мінаю толькі Беласток,
Як земляка свайго, гасцінна
Мяне вітаюць тут здалёк.

А чым бліжэй да роднай хаты,
Тым даражэй бацькоўскі кут.
І нату цягніку дзяўчаты
Мне прапануюць месца тут.

Я адмаўляюся, вядома,
А сэрца б'ецца гарачэй,
Прыемна мне, што я ўжо дома,
Што я сярод сваіх людзей.

Што я заўжды тут у пашане,
Як у старых, так і ў малых,
Што любяць тут мяне сяляне,
За тое, што люблю я іх.

А да народа, да Айчыны,
Любоў мая мацней штогод.
Свайго народа я часціна,
А ў маім сэрцы ўвесь народ.

*СНЮ ЦЯБЕ Я, ВЁСКА МОРА*

Родная ты, вёска Мора,
Ўбачу я цябе няскора,
Да цябе далёкі шлях.
І на шумных тратуарах
У маіх жывеш ты марах,
І ў маіх жывеш ты снах.

Сню: з вялікаю натугай,
Я ару зямельку плугам,
Плуг нялёгка мне ўтрымаць.
І з агромністай сявенькі
Я, хлапчына маладзенькі,
Еду зерне рассяваць.

На плячы з касой кляпанай
Луг касіць іду я рана,
З белай срэбранай расой.
Зноўку серп бяру зублёны,
Жаць іду з ім на загоны,
На палетак родны свой.

Сню, як мы зімой заўзята
На таку цапамі з татам
Змалацілі ўвесь авёс.
У марозны час зімовы
З Белавежскай пушчы дровы
З татам позняй ноччу вёз.

Снілася, што ў сенцах жыта
З татам я малоў нібыта
На хлеб чорны, аржаны.
Хлеб пякла матуля потым,
Елі мы яго з ахвотай...
Сны, цудоўныя вы, сны!

Не злічу ўжо раз каторы,
Снішся мне ты, вёска Мора,
І мая там маладосць.
Надалей мне часта сніся,
Хоць у снах мне адазвіся,
Я ж цяпер твой рэдкі госць.

KAMUNIKAT.org

***

Кіруеш, аслабелы зрок
Туды, дзе мае праз хвіліну
Цягнік праходзіць, мо здалёк
Вязе ён дарагога сына.

А ён і сапраўды прывёз!
З усмешкай сын дадому крочыць,
І ты стрымаць не можаш слёз,
Твае ад шчасця плачуць вочы.

Але на жаль, твой сын ізноў
Пакіне дом. Засвішча вецер...
На развітанне замест слоў
Ты плачаш зноў, як пры сустрэчы.

О, колькі ў сэрцы пачуцця!
З прычыны радасці, ці гора,
Слёз з першых дзён свайго жыцця
Матуля выплакала мора.

KAMUNIKAT.org

*СУШАНЫЯ ГРУШЫ*

Я памятаю час асенні,
Мне і дагэтуль пахнуць грушы,
Што ў печы хлебнай на чарэні
Матуля безупынку сушыць.

І пах мядовы ў нашай хаце,
І выгляд груш такі харошы,
Што выгартае з печы маці
І спакваля ссыпае ў кошык.

Яны зімуюць у каморы,
І асабліва, калі святы
Іх мама прыгаршчамі дорыць
Усім, хто толькі прыйдзе ў хату.

Матуля, помню, грушы варыць,
Ямо, ажно трасуцца вушы...
Зноў у мінулым мае мары:
Мне сняцца сушаныя грушы.

*ПАЛЯВЫЯ ДАРОГІ*

Палявыя дарогі
Між гаёў і палеткаў,
Мае босыя ногі
Вас краналіся ўлетку.

На пастронку карову
Тут я пасвіў на золку.
Тут ў полі жытнёвым
Слухаў крык перапёлкі.

Палявыя дарогі
Павялі ў свет шырокі,
Затаміліся ногі,
Запаволелі крокі...

Палявыя дарогі
Па вандроўках багатых
Давядуць да парога
Роднай бацькавай хаты.



KAMUNIKAT.org

*ПАДЛЕТАК*

Калі я быў яшчэ падлеткам,
Дык жыў у вёсцы пад страхой
І ўжо касу цягаў у летку,
Хадзіў за плугам баразной.

Матуля падвяла падлікі,
Сказала: сёння, мой сынок,
Ты ў нас ужо зусім вялікі,
Ты ў нас ужо цяпер „атрок”.

І слова дзіўнае, што мама
Сказала з гонарам тады,
Мне моцна ўрэзалася ў памяць,
Яго не сцерлі і гады.

Хоць я пайшоў у свет шырокі,
Пакінуў родныя палі,
А помню, калі быў „атрокам”,
Я на руках меў мазалі.

*АПУСЦЕЛАЯ ВЁСКА*

Пайшоў бацька наш следам,
Як і трэба, за дзедам,
Гаспадарыў у вёсцы
На збяднелай палосцы.
Ну і мы ўслед за татам
Гаспадарылі з братам.
Ды ўжо нашыя дзеці
Разбрыліся па свеце.
У вясковых мы хатах
Дажываем век з братам.
Апусцела ўжо вёска,
Зарастае палоска.

KAMUNIKAT.org

*ПОЎНА ХАТА*
*ЭКСПАНАТАЎ*

Дзедаўская хата
Поўна экспанатаў.
З карэнняў калыска,
Гліняная міска,
Драўляная лыжка,
Двайная гладышка,
Святыя іконы,
Круглы серп зублёны,
Вялікія кросны,
Кадаўбец дзівосны,
Каменныя жорны,
Дзяжа на хлеб чорны.
Стары калаўротак,
Са сноўніцай мотак,
Гладкая качалка,
Крэсіва-запалка...
Толькі з гэтай хаты
Зніклі экспанаты.

KAMUNIKAT.org

***

Была зямля і добры дом –
Лічыўся бацька кулаком.
Хоць на руках меў мазалі
І быў амаль што інвалід.
Хаця з прычыны хворых ног
Ён працаваць ужо не мог –
Сцвярджалася заўсёды так:
Як ёсць зямля, дык ты - кулак!
Было нядобра штосьці мець,
Ніхто не мог разбагацець.
Калі ты голы, як жабрак,
Тады ты добры, – ты бядняк!
Тады быў дзіўны падыход,
Дзялілі як маглі народ.
І з кожным годам, кожным днём
Край станавіўся бедняком.
І толькі – як пратэсту знак –
Рука сціскалася ў кулак!
На шчасце, прамінуў той час,
Што ў жабракі выводзіў нас.

KAMUNIKAT.org

*СТАЛЁВЫЯ КОНІ*

Ох, не коней я сягоння
Бачу ў вёсцы на двары:
Замянілі ўсюды коней
Канкурэнты-трактары.

А бывала, пару коней
Мелі тут гаспадары,
Іх жыцця, што за іронія,
Пазбаўдяюць трактары.

На загоне рэдкасць коні –
Тых зямель уладары.
Толькі тут туркочуць, звоняць
Усеўладна трактары.

І ніхто іх не бароніць –
Адыходзяць без пары...
Хочуць зжыць са свету коней
Канкурэнты-трактары.

KAMUNIKAT.org

*СКАЖУ, БЫВАЛА: ЕДУ ДА БАЦЬКОЎ*

Скажу, бывала: еду да бацькоў,
І родзіцца ў душы настрой прыўзняты,
Што вось убачу іх, старых, ізноў
І прывітаю на парозе хаты.

Скажу, бывала: еду да бацькоў,
І клопаты знікаюць, абавязкі,
І адчуваю ўцеху цёплых слоў,
І мора дабраты, і мора ласкі.

Яшчэ і сёння: еду да бацькоў,
Скажу нібы па звычцы, не іначай,
І ў гэты міг паверыць я гатоў,
Што там, у хаце, іх жывых убачу.

Скажу я сёння: еду да бацькоў,
Цяжарам сум узваліцца на плечы,
Агорне роспач, як з усіх куткоў
Глядзіць мне ў вочы скрушная пустэча.

Скажу я сёння: еду да бацькоў,
І цэлы свет становіцца нямілы,
Стаю маўкліва я ля двух крыжоў,
Што там вартуюць родныя магілы.

*ХЛЕБ*

Калісьці ў жорнах самавітых -
Здабытку мудрай даўніны,
Малола маці зерне жыта
На хлеб духмяны, аржаны.

Муку матуля расчыняла
На квасе хлебным у дзяжы,
Мясіла, ручніком вязала,
,,Ты, хлеб, з дзяжы не пабяжы".

І, выпясціўшы бохан кожны,
Паклаўшы на лапчасты хрэн,
Іх на лапаце асцярожна
Стаўляла ў печку на чарэн.

Пасля са скваркай, ці капустай,
Ці з соллю, як была бяда,
Давала ў рукі хлеба лусту...
Вось дзе, скажу, была яда!

KAMUNIKAT.org

*ПАДЗЯКА*

За заплаканыя вочы,
За недаспаныя ночы,
За кожную казку,
За дабрату і ласку,
За матчыну пяшчоту,
За вечную турботу,
За цёплыя словы,
За любоў да мовы,
За роднасць з палямі
Дзякую Табе,
Мая Мама.

KAMUNIKAT.org

## *ДЗВЕ МАТКІ*

У сястрынай хаце
век дажывалі
дзве маці
родныя:
яе і мужа.
Адна кволая,
нядужая,
другая –
сляпая.
Тая,
што мела зрок,
вяла сляпую
ў садок,
збірала
грушы ў кошык.
Сляпая
нясла
ў хату ношу.
Радасць
на тварах
у маці:
яшчэ патрэбныя
ў хаце.

KAMUNIKAT.org

## *СКРЫНЯ*

*Памяці Маці*

Жыве заўсёды ва ўспаміне,
І памяць гэтага не траціць,
Пасажная матулі скрыня,
А ў ёй дзявочае багацце.

Тут сапраўды ўсё для матулі,
Усё, што да жыцця ёй трэба:
Шмат блузак, саяноў, кашуляў
З ільну, што рос на роднай глебе.

І ручнікі, што вышывала,
І хусткі, абрусы – без ліку,
І нават тыя, што прыдбала
На шлюб уласны чаравікі.

Хоць маладою стала жонкай,
А памятала і аб смерці.
Была тут да труны іконка
У надта ўжо старым канверце

І нават падарункі дзецям...
Было да часу прыхавана
Усё, што толькі ёсць у свеце,
У скрыні той зачараванай.

KAMUNIKAT.org

Калі спачыла ў дамавіне
Жыццём знясіленая маці,
Замкнулася навечна скрыня
І болей не стаіць у хаце.

І мноства, мноства мар дзіцячых
Пайшло ў нябыт з чароўнай скрыняй.
Але жыве ўспамін гарачы,
Які ніколі не астыне.

KAMUNIKAT.org

*ТАК МАЛА СЛАЎ ЛІСТОЎ ДАХАТЫ*

Так мала слаў лістоў дахаты,
Хоць іх чытаць любіў мой тата.

Татулькі роднага не стала.
Шкадую, што пісаў так мала.

Далей няшмат пісаў таксама.
Чытаць не ўмела мая мама.

Цяпер хварэю я душою,
Няма бацькоў - няма спакою.

KAMUNIKAT.org

## *ВОДАПРАВОД*

*Жыхарам вёскі Мора*

Было калісь тут многа гора
І многа ўсякае бяды.
І, як не дзіўна, быў у Моры
І часты недахоп вады.

І на карамыслах насілі
З вадою вёдры мы здалёк
І трацілі празмерна сілы –
Тады быў цяжкі кожны крок.

Жыццё мяняецца няспынна.
Аб гэтым нат не сніў народ:
Ад студні новае, глыбіннай,
Тут правялі водаправод.

І задаволены сяляне:
„Цяпер лягчэй нам стала жыць.
Вадзіца ёсць у кожным кране,
Не трэба вёдрамі насіць”.

*ПАЎСТАНАК МОРА*

Я на Цэнтральным. Еду скорым:
Ён у тунэлі пада мной.
Прашу білет: паўстанак Мора,
А ў сэрцы радасны настрой.

І як жа тут не ганарыцца!
Таго ніколі не было:
Вядомым стала і ў сталіцы
Маё далёкае сяло.

Няўмольны час імчыць няспынна
І гоніць нас: ,,Хутчэй, хутчэй!”.
І Мора стала на гадзіну
Цяпер ад горада бліжэй.

KAMUNIKAT.org

*ПАСТАЛЫ*

Мы не паходзілі з вяльмож,
Аб тым не снілі ў снах.
Хадзілі летам басанож,
Зімой у пасталах.

Стары, бывала, і малы,
Вясковы ўвесь народ
Абуты быў у пасталы,
Насіў іх з году ў год.

З абуткам клопат быў, машын
Было няшмат тады,
Гумовых не ставала шын
На пасталы хаўжды.

Усё ж не шанаваў той час
Абутку нашых сёл.
Была ж і пагаворка ў нас:
Дурны ты, як пастол.

*ПЕРШЫЯ БОТЫ*

Азваўся тата: „Ты з ахвотай
Пачаў вучыцца ў пятым класе.
Купіў, сынок, табе я боты,
Што вырас з іх Рыгораў Вася”.

Я ў рукі ўзяў дарунак таты,
Ад шчасця цалаваць гатовы.
Як на бяду ў той час да хаты
Прыйшло шмат хлапчукоў вясковых.

Адзін з іх, жартаўнік, гарэза,
З рук вырыў боты і гаворыць:
,,А я дарунак твой парэжу”,
З кішэні выняў нат сцізорык.

А я, наіўны, і паверыў,
І помню, што страшэнна плакаў,
Аж покуль за сабою дзверы
Не зачыніў гарэза Якаў.

У ночы абліваўся потам,
Мне снілася, што рэжуць зноўку
Мне татам купленыя боты,
Найпершую ў жыцці абноўку.

*ЗАМОВЫ*

*Памяці бабулі*

Калі прыйшло дахаты ліха,
Хвароба кінула на ложак,
Тады, вядома, Малешыха
У кожным выпадку паможа.

І памяць добра захавала
Шмат успамінаў хлапчуковых:
Як нада мной яна шаптала
Свае дзівосныя замовы.

Замоваў тых было без ліку:
І ад спалохаў, і ад ранаў,
Найболыш дык ад хвароб шматлікіх;
Хварэлі людзі пастаянна.

А як бабулю, несумненна,
Усе цаніць яе павінны.
Не аднаму тут пакаленню
Яна вязала пупавіны.

Бабулі нашае не стала.
З сабой забрала ўсе замовы.
Цяпер у хаце родзяць мала.
Замовы ў нас – пустыя словы.

Змяніўся побыт наш вясковы,
І ў новым свеце мы адчулі:
Былі патрэбны і замовы,
Былі патрэбны і бабулі.

KAMUNIKAT.org

*НЕКАТОРЫМ ІНТЭЛІГЕНТАМ*

Сіла народа ў яго інтэлігенцыі
*А. Чэхаў*

Пераязджаем з вёскі ў горад
І вёску забываем скора.
І вельмі хутка гарадскою
Мы пакрываемся лускою.

Чым лепш апрануты, больш сыты,
Ты, родны дом, хутчэй забыты.
Нас так высока ўзносяць стромы,
Што забываем нават, хто мы.

KAMUNIKAT.org

## *І СЭРЦАЎ ІХ АПОШНЯЕ БІЦЦЁ*

*Памяцці Бацькоў прысвячаю*

Пакуль пульсуе ў жылах кроў
І цепліццаа маё жыццё,
Мне не забыць маіх Бацькоў
І сэрцаў іх апошняе біццё.

Я берагу да іх любоў,
Сваё святое пачуццё.
Мне не забыць маіх Бацькоў
І сэрцаў іх апошняе біццё.

Хоць не сустрэну іх ізноў –
Мне іх не верне небыццё.
Мне не забыць маіх Бацькоў
І сэрцаў іх апошняе біццё.

І ў час трывожных, сумных сноў
Заплачу горка, як дзіцё,
Пачуўшы зноў маіх Бацькоў
І сэрцаў іх апошняе біццё.

KAMUNIKAT.org

*Я БЕЛАРУС*

Я беларус, рос у народнай гушчы,
Сярод палёў, уквечаных лугоў,
Пад дзіўны гоман Белавежскай пушчы,
Пад заліўныя трэлі салаўёў.

Я беларус, рос у сялянскай хаце,
У свет выходзіў праз яе парог.
Сваю любоў да бацькі, і да маці
У глыбіні грудзей сваіх збярог.

Я беларус, я сваёй роднай мове
Яшчэ дзіцём вучыўся ад бацькоў.
І слова роднае – мой лёс у гэтым слове -
Мне даражэй, чым з іншых сотні слоў.

Я беларус і гэтым ганаруся.
Усім душу сваю магу адкрыць:
Ніколі і нідзе не адракуся,
Што беларусам жыў і буду жыць!

KAMUNIKAT.org

## *РОДНАЯ МОВА*

Мова ты родная, мова прыгожая,
Як жа мы можам цябе не любіць!
Ты пратрывала атакі варожыя,
Не здолеў ніхто цябе пакарыць.

Ты пад страхою знайшла саламянаю
Лепшы прытулак ад бед і нягод,
Носіць цябе з найвялікшай пашанаю
У сэрцы сваім беларускі народ.

Родная мова Купалы і Коласа,
Мусіш свае ты правы адстаяць,
Каб у журбе не гучаць напоўголаса -
Месца пачэснае ў свеце заняць.

Ёсць, можа, мовы яшчэ прыгажэйшыя,
Я ж паўтараць безупынку гатоў:
Мне наймілейшая, найдаражэйшая,
Найласкавейшая – мова бацькоў.

***

Прывабнасць кожнай кветкі-краскі
І сэрца кожнага раскоша
Ёсць у звароце
,,Калі ласка”
У польскай мове
,,Bardzo proszę”.

Убачыш сонечны прамень,
За ім і дня таемны вобраз
У прывітанні
,,Добры дзень”
А адпаведна і
,,Dzień dobry”.

І беларусаў, і палякаў
Заўжды аднолькава хвалюе
І дарагое слова
,,Дзякуй”
І непаўторнае
,,Dziękuję”.

KAMUNIKAT.org

## *ДЗЕСЯЦЬ ЗАПАВЕДЗЯЎ*

Мову родную беражы.
Мовай роднаю даражы.
Мову родную шануй.
Мовай роднаю не гандлюй.
Мову родную любі.
Мову ў сэрцы не губі.
Мовы роднае не кідай.
Мову дзецам перадай.
Мовы не аддай на здзек.
Толькі з ёю жыцьме ж век.

KAMUNIKAT.org

*СЛОВА ТЫ, РОДНАЕ СЛОВА*

Слова маё дарагое,
Я нарадзіўся з табою,
З радасцю нёс праз жыццё.
Ты не ідзі ў небыццё.
Слова, табе я аддany,
Вечна з табою з’яднаны.
Слова, нашу цябе ў сэрцы,
Каб не было ў паняверцы.
Слова, табе я малюся.
Слова, цябе не зракуся.
Слова, ты клятва мая,
Вечны з тобай толькі я.
Іншым цябе я дару,
Але з табою памру.
Слова ты, роднае слова,
Мая беларуская мова!

KAMUNIKAT.org

## *МОВА, ВЕРУ Ў ТВАЮ НЕЎМІРУЧАСЦЬ*

Калі заўтра мова мая счэзне,
Сёння я памерці ўжо гатоў.
*Р. Гамзатаў*

Мова несмяротная, святая,
Будзеш ты гукаць мацней штогод.
Калі толькі мова памірае,
Значыць, памірае і народ.

А народ мой будзе жыць бясконца.
І, як сцяг у вопытных руках,
Мову панясуць сваю пад сонцам
Пакаленні ў будучых вяках.

Роднай мовай будуць ганарыцца,
Мовы не ўкрадзе жыццёвы вір:
Як вадзіцу з роднае крыніцы,
Будуць піць адвечны эліксір.

І сціскае сэрца боль пякучы,
Калі нехта з мовы роднай кпіць.
Мова, веру: лёс твой неўміручы,
Я памру, ты вечна будзеш жыць!

## *ЯК ЖЫЦЬ БЕЗ ВЕРЫ, БЕЗ НАДЗЕІ*

Хоць час і горбіць мае плечы,
Як перад многімі гадамі,
Люблю так ездзіць на сустрэчы
Я з дарагімі слухачамі.

А на сустрэчах свае кніжкі
Падпісваў я, як памятаю,
Надзеям, Верам, Васям, Мішкам,
Сяргеям, Толям, Мікалаям.

Мне кажуць: не сустрэць ніколі
У нашых школах Надзі, Веры,
Усе – Данксі, Стасі, Ёлі,
Бэаты, Весі, Казімеры.

У час такіх сустрэч заўсёды
Становіцца мне сумна неяк.
Калі нам не мінуць нягоды,
Як жыць без веры, без надзеі?

KAMUNIKAT.org

*ПАГОНЯ*

> З Варшавы ў Беласток курсіруе
> цягнік „Пагоня”.

Імчаць, імчаць стальныя коні
Мяне з Варшавы ў Беласток.
Я легендарнае Пагоні
Магутны раптам чую крок.

Наша мінуўшчына старая
Далёкіх продкаў-крывічоў
У маім сэрцы ўваскрасае
І грукат конскіх капытоў.

Імчаць, імчаць на конях воі
Навале грознай наўздагон,
Каб не было тут больш разбою,
За волю, за спакойны сон.

Дружына воінаў у броні
Імчыць наперад і імчыць.
Славянскай нашае Пагоні
І не стрымаць, і не спыніць.

kamunikat.org

*ЗАЎЖДЫ ГАТОЎ*

І ўсім шляхам дамоў,
І чуласці бацькоў,
І гукам родных слоў,
І шчодрасці палёў,
І водару лугоў,
І пошуму лясоў, -
Пакуль пульсуе кроў,
Ім вернасць і любоў
Я берагчы гатоў.

*ВЯРНУСЯ*

Даўно я выйшаў з вёскі Мора,
У маладым яшчэ жыцці.
Іду я пастаянна ў горад
І не магу ніяк дайсці,

І з гарадской бетоннай клеткі
На яве, а таксама ў снах,
Імкнецца сэрца на палеткі,
Туды, дзе мой пачаўся шлях.

Мой дарагі куток айчынны,
Мой беларусе, крэўны брат,
Я вас ніколі не пакіну,
Да вас вярнуся я назад.

KAMUNIKAT.org

# 3

-------

KAMUNIKAT.org

*БЕЛАСТОК*

Я тут сярод свайго народа,
Сустрэнеш сябра тут заўсёды,
Калі прыедзеш незнарок.
О Беласток мой, Беласток!

Не на тваёй зямлі ўрадлівай
Закаласіла наша ,,Ніва”?
Нажалі не адзін снапок.
О Беласток мой, Беласток!

На вуліцах старых і вузкіх
Рух нарадзіўся беларускі,
Тут не адзін зрабіў я крок.
О Беласток мой, Беласток!

Я аб табе заўсёды мару,
Маім ты сэрцам уладарыш,
Цябе вітаю я здалёк.
О, Беласток мой, Беласток!

KAMUNIKAT.org

*З ПАДАРОЖЖА*

\- Цёзка,
Вы з вёскі?
\- Не, пане,
Мы не сяляне.

\- Тады, дружа,
Вы адкуль жа?
\- Мы, пане,
Мяшчане.

\- А хто вы
Па мове?
\- Мы, пане,
Беластачане.

*У ЦЯГНІКУ*

З бетоннай спальні гарадской
Усё жыццё сваё няспынна
Імкнуся сэрцам і душой
Я да сваёй малой Айчыны.

У цягніку, у цягніку,
Паміж Варшавай- Беластокам,
Я дні жыцця свайго таўку,
Нібы іду марудным крокам.

Жыву як заяц на мяжы,
Што не сагрэе свайго следу,
Усім чужы, усім чужы,
Калі ж я да сваіх даеду?

Калі ж сыду я з цягніка
І больш не буду толькі госцям
У краі брата-земляка,
На родных сцежках маладосці?

*Я НЕ ПАТРЭБНЫ ТУТ НІКОМУ*

Я непатрэбны тут нікому,
У калаўроце гарадскім.
Мне вельмі хочацца дадому,
Туды, дзе буду родны ўсім.

Хачу сардэчна пакланіцца
Палям айчынным і лугам.
Напіцца з роднае крыніцы,
Даць волю сэрцу і нагам.

Хачу пачуць спеў жаўруковы,
І гоман белавежскіх дрэў,
І гукі беларускай мовы,
І песні роднае напеў.

Хачу я ўвас, лугі і гоні,
Пакінуць тлум увесь і зман
Да болю сціснуўшы далоні
З зямлёю зродненых сялян.

*НАЛЕЖНЫ РАНГ*

*Прафесару*
*А. Абрэмбскай-Яблонскай*

Варшава,
старыя муры -
святыні навукі.
Тут
сотні год
розных моў гукі
вывучалі старанна
за студэнцкай партай.

Ды толькі
да гэтай пары
не гучалі тут словы
роднай
маёй
беларускае мовы,
якой праз вякі
пагарджалі упарта.
А сёння
калі у нябыт
ідзе час нязгоды,
калі спалучае
сяброўства народы,
правы атрымаў
той,

хто быў пагарджаны.
Таму вось
паляк, беларус
тут
у сталіцы,
мовы маёй
вывучаюць крыніцы.
Мова збліжае
і вучыць пашане.

KAMUNIKAT.org

*МЫ – ЗГУРТАВАНЫЯ*

*(Да 15-годдзя БГКТ)*

А хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?
- Беларусы.
*Я. Купала*

Мы – згуртаваныя,
Мы – аб'яднаныя
Матчынай моваю
І роднай песняй.
З душой крылатаю
Выйшлі аратыя
На нівы свежыя
Сустрэць прадвесне.

І жменяй поўнаю
На скібы роўныя
З натхненнем сеялі
Шчасця зярняты.
Нівы ўраджайныя
І рукі дбайныя
Штогод прыносілі
Нам плён багаты.

Мы – не лапцюжныя,
Сям'ёю дружнаю
Ідзём у светлае

Заўтра краіны.
Палякам – роўныя,
Славянам – кроўныя.
Супольны дом наш –
Наша Айчына.

KAMUNIKAT.org

## *ГАДЫ МАЛАНКАВА ПРАХОДЗЯЦЬ*

*Настаўнікам і вучням Бельскага беларускага ліцэя імя Бранкслава Тарашкевіча*

Гады маланкава праходзяць.
Здаецца мне, што толькі ўчора
Пакіну ў школу, асяроддзе
І развітаўся з вёскай Мора.

А колькі ж новых пакаленняў
З парога школы ў свет ступілі.
І здзейсніліся летуценні,
Якія ў сэрцы мы таілі.

Куды б нас толькі лёс ні кінуў
У нашай долі і нядолі,
Мы ў сэрцах кожную хвіліну
Удзячнасць носім роднай школе.

Гады маланкава праходзяць,
І затрымаць іх немагчыма.
За намі ўжо саракагоддзе
І нашай школы, і Радзімы.

## *ЗЯРНЯТЫ РОДНАЙ МОВЫ СЕЕМ*

*Алесю Барскаму*

Ад гулкіх вуліц Беластока,
Да стромкіх сосен Белаважы,
Сваёй Радзімы сінявокай
Прайшлі мы, дружа, многа сцежак.

Ішоў з нас кожны, як араты,
Па родных веснавых палетках,
Як сейбіт, рассяваў зярняты,
Каб колас даспяваў улетку.

Мы год за годам карпатліва
Ідзем туды, дзе люд вясковы,
Рассейваем на роднай ніве
Зярняты беларускай мовы.

Жыццё імчыць надзвычай шпарка,
А жыць не вечна чалавеку.
Дык, мілы дружа, вып'ем чарку
За тое, што пражыў паўвеку.



kamunikat.org

*ЮБІЛЕЙНАЕ*

*Актывістам БГКТ*

Мы карпатліва чвэрць стагоддзя
Культуры роднай зерне сеем.
І пашыраем у народзе
Святыя ўзнёслыя ідэі.

Што беларус не з горшай гліны,
Што не жыве з чужое ласкі,
Што мае тут сваю Айчыну,
Свае правы і абавязкі.

І што ніколі ён, ніколі
На можа роднага цуращца,
Што ён – змагар за сваю долю,
Што гонар беларусам звацца.

## *ПЕСНЯ, ТЫ - РАДАСЦЬ І НАДЗЕЯ*

*Гарадоцкаму мастацкаму калектыву*
*ў трыццатыя ўгодкі*

Без роднай песні жыць не можна,
Без роднай песні мы нямеем.
Яна – жыццёвы спадарожнік,
І наша радасць, і надзея.

Развее сумныя хвіліны
Пад мірным небам васільковым,
Уславіць нашую Айчыну,
І наш народ, і нашу мову.

Усхваліць нашыя здзяйсненні,
І радасць працы, і кахання,
Народа творчае гарэнне,
Яго турботы, хваляванні.

І прамінае год за годам,
Як снег зімовы на прадвесні.
Ды будзе маладым заўсёды,
Хто праз жыццё праходзіць з песняй.

*НАШ НАСТАЎНІК*

*Памяці Васіля Бахара*

Над шматпакутнаю зямлёй
Дыхнула ўрэшце мірам неба.
Апаленыя ўсе вайной
Асветы праглі мы, як хлеба.

І нас усіх ласкавы лёс
З сёл навакольных, проста з поля,
Сабраў ля гайнаўскіх бяроз
У роднай беларускай школе.

А на парозе школы Ён,
Як бацька, усіх вітаў сардэчна,
І сэрцы нашыя ў палон
З часіны той узяў навечна.

Умела прывіваў любоў
Ён да народа, да Радзімы,
Да родных беларускіх слоў,
Якія сталі нам святымі.

# 4

--------

KAMUNIKAT.org

*СЯМЕЙНАЕ ШЧАСЦЕ*

Сямейнае шчасце, сямейнае шчасце,
Людская адвечная мара.
Імкненні, здзяйсненні, вялікія страсці,
Уступкі і нават ахвяры.

Я шчасця яшчэ не спазнаў ані трошкі,
Бо лёс мой склаўся няўдала,
Як быццам прабегла мне чорная кошка
Дарогу і шчасцейка ўкрала.

Калі ім пароўну нас бог надзяляе,
Дык шчасцейейка позна ці рана.
Якое з надзеяю кожны чакае,
Пастукае ў дом нечакана.

А прыйдзе і ўжо застанецца са мною,
Адкрыю яму сэрца насцеж.
І збудзецца ўрэшце жаданая мроя –
Жыць будзе са мной маё шчасце.

KAMUNIKAT.org

## *ПРЫЙДЗІ, ДОЎГАЧАКАНАЯ ЛЮБОЎ*

Любви все возрасты покорны
*А. Пушкін*

Растрачана, прызнацца, маладосць,
І перажыта грознае крушэнне.
Усё, што адбылося і што ёсць,
Далёкае ад мараў, летуценняў.

А тут бягуць у далячынь гады,
Жыццё беспаваротнае ўцякае.
І хоць я ўжо зусім не малады,
Аднак чагосьці ўсё яшчэ чакаю.

Ласкавасці чакаю новах дзён
І спозненага вернага кахання.
Больш мой цягнік не пойдзе пададхон,
Знайду мо крышку пачуцця, прызнання.

Мне адзіноты досыць шмат гадоў,
Даволі мне ўжо сумнае разлукі.
У кайданы твае, мая любоў,
Добраахвотна падстаўляю рукі.

*ТЫ НЕДЗЕ ЁСЦЬ*

А я чакаю, я шукаю,
За мною ўжо і маладосць.
Хоць не знайшоў яшчэ, ды знаю:?
Ты недзе ёсць, ты недзе ёсць.

Вось прамінула і паўвеку.
Гады, як злодзей, час крадзе.
Сабе па сэрцы чалавека
Шукаю, ды няма нідзе.

Людзей пад сонцам вельмі многа
Ідзе сцяжынкаю сваёй.
Мо нашы сыдуцца дарогі
І сутыкнёмся мы з табой?

Ты недзе ёсць, ты ёсць напэўна,
Мне самы блізкі чалавек.
Мая любоў, мая царэўна,
Няўжо шукаць цябе мне век?

KAMUNIKAT.org

***

Любоў мая не патушы агню,
Няхай пяюць тваіх настрояў слонкі.
Мы дабяжым да сэрцаў,
Мы не зломкі.

*Д. Бічэль-Загнетава*

Ад сэрца да сэрца шлях далёкі.
Ад сэрца да сэрца – шлях нялёгкі.
Бягу, стаміўшыся, іду –
Другога сэрца не знайду.

Я ўсё шукаю ды шукаю –
Хаджу амаль ўжо ў адчаі, -
Здаецца, што яго ўжо угледзеў,
Ды сэрца зноў прапала недзе.

Згубілася ў жыццёвым моры.
І да каго ж ісці з дакорам?
Не, духам я не ўпаў, здаецца.
Магчыма, пабач сэрца б’ецца,
Якое, як аб лепшай долі,
Аб іншым сэрцы сніць міжволі.

І мне не проста жыць, паверце,
Шукаючы другое сэрца.
Жыць без яго я не магу,
Усё жыццё за ім бягу....

*САНЕТ*

А ты, каханая, адна ў мяне на свеце,
У сэрцы стомленым маім жывеш адна.
Мае пачуцці выгараць да дна,
Заўсёды ты ў іх будзеш на прыкмеце.

Жывеш ты і ў маіх цудоўных снах,
А сню цябе я на ўзбярэжжы мора.
На фоне вадзяной жывой прасторы
Барвовіць цела сонца і вясна.

Мне ад цябе нідзе ўжо не ўцячы,
Ды і ўцякаць нікуды мне не трэба.
Нам не расстацца болей, улічы:
На гэты лёс нас асудзіла неба.

О Ты, прычына вечных летуценняў,
Крыніца маіх роздумаў, натхнення!

*ТРЫЯЛЕТЫ*

З незвычайнай душою жанчына
Мне пасеяла ў сэрцы трывогу.
І мне болей не трэба нічога.
З незвычайнай душою жанчына.
Не шукаю ніякай прычыны,
Хоць прычын усялякіх ёсць многа.
З незвычайнай душою жанчына
Мне пасеяла ў сэрцы трывогу.

**

Мне да шчасця нямногае трэба,
Толькі ў сэрцы не мець адзіноты,
Адчуваць крышку ласкі, пяшчоты,
Мне да шчасця нямногае трэба.
Мець штодзённа скарыначку хлеба
І душы рамантычныя ўзлёты.
Мне да шчасця нямногае трэба,
Толькі ў сэрцы не мець адзіноты.

KAMUNIKAT.org

***

Сцяжыны той мне не забыць ніколі,
Якою ад яе калісьці крочыў.
Упершыню рукам сваім даў волю –
Абняў нясмела стан яе дзявочы.

І ўпершыню ў блакітныя, да болю,
Ды сумныя чамусці глянуў вочы.
І іх пагляд, відаць, мяне сурочыў:
Сцяжыны той мне не забыць ніколі.

KAMUNIKAT.org

## *ТЫ ПАЗВАНІ ІЗНОЎ МНЕ, ПАЗВАНІ*

Якое ж вынаходства тэлефон!
Пачуў я ў трубцы твой цудоўны голас,
І ціха, ціха стала так наўкола,
Як быццам сэрцы спалучыў нам ён.

І мне здалося, што пачуў я стук,
Паскораны стук сэрцаў палымяных,
І што цябе я ўбачу нечакана,
Што чую ўжо цяплю ласкавых рук.

Мне нестае тваіх пяшчотных слоў!
Здаецца, ўжо не чуў я іх адвеку,
Як ласка, слова патрэба чалавеку.
У шчырым слове радасць, боль, любоў.

Калі замоўк раптоўна голас твой,
Ізноў мне сэрца сціснулася болем,
Напоўнілася сумам як ніколі,
І каменем у ім лёг неспакой.

## *БУКЕТ ГВАЗДЗІКОЎ*

Вакзал.
Перон.
Стаю я між людзей.
Кругом трывожнае чаканне.
Стаю
і прытуляю да грудзей
букет гваздзікі-зоркі ў цэлафане.
Гудок
здалёк.
На гарызонце дым
і колаў стук расце няспынна.
Віруюць думкі аб адным:
Ці едзе мілая дзяўчына?
Цягнік надзей
спыніў свой доўгі ход,
дыхнуў агнём з грудзей гарачых.
З вагонаў выплыў на перон народ –
на жаль, каханае не бачу.
Няма.
Дарма
яе шукае зрок.
У сэрцы сум расце вялікі.
Адхлынуў прэч людскі паток.
Трымаю непатрэбныя гваздзікі.
Туды,
сюды

бязмэтна я хадзіў.
У сэрцы боль перамагаў каханне...
Жанчыне незнаёмай я ўручыў
гваздзікі-зоркі ў цэлафане.

KAMUNIKAT.org

*ДАЗВОЛЬ ЦЯБЕ КАХАЦЬ*

Мне сумна так, мне сумна, дарагая,
Балюча так, што слёзаў не стрымаць.
Прашу цябе, малю цябе ўадчаі:
Дазволь цябе, дазволь цябе кахаць.

Далёка так я ад цябе, далёка,
Што толькі ў думках і магу паслаць
Сваё прызнанне-просьбу сінявокай:
Дазволь цябе, дазволь цябе кахаць.

Мне вечнасцю здаецца час расстання,
На жаль, канца расстання не відаць.
Я шлю сваё сардэчнае жаданне:
Дазволь цябе, дазволь цябе кахаць.

І з кожным новым днём расце, мацнее
Неўтаймаваны ў маім сэрцы боль.
Прашу цябе з вялікаю надзеяй:
Кахаць цябе, кахаць цябе дазволь.

KAMUNIKAT.org

*СУНІЦЫ*

Як зоры на паляне,
Рассыпаны суніцы.
Нясе ўжо іх у збане
Дзяўчына-чараўніца.

А хлопец крочыў следам
І папрасіў вадзіцы,
Як быццам бы не ведаў,
Што ў збане тым суніцы.

Калі ізноўку глянуў,
Не злічыш раз каторы,
Убачыў зоркі ў збане
І вочы, быццам зоры.

KAMUNIKAT.org

***

Па леце людак строй смуткуе.
Лісцём заплакалі галіны.
З кім у дарогу паплыву я?
Хіба ўжо толькі з успамінам.

Ты адплыла, застаўся з марай,
Як Рабінзон пасля крушэння.
Блукаю ў восеньскім пажары...
Я сам таксама ўжо асенні.

KAMUNIKAT.org

*ЗОРКІ*

Заіскрыліся зоркі ў галінах.
Іх, здаецца, рукою б сабраў
Па чарзе і чароўнай дзяўчыне
Шнур караляў я б з іх нанізаў.

Ды няўлоўныя зоркі, як шчасце,
Надта зманлівы іх дзіўны свет.
Як усмешка няўлоўная Насці,
Як затоены ў сэрцы сакрэт.

KAMUNIKAT.org

*ПЕРШЫ СНЕГ*

Быў гэта першы пухкі снег
І першае з табой спатканне.
Час прыпыніў, здаецца, бег,
Світанне робіцца змярканнем.

Здаваўся лістапад вясной,
Снег зімні – цёплаю пярынай.
І я шчаслівы быў з табой,
Мая каханая дзяўчына.

Я вуснамі, як чарадзей,
Лавіў сняжынкі з твайго твару.
Глядзеў у глыб тваіх вачэй,
І абдымаў твой стан, і марыў...

Мінулі многія гады
І не адзін снег выпаў ранні.
Ды будуць першымі заўжды
Той снег і нашае спатканне

KAMUNIKAT.org

*ГАДЫ Ў НАС МАЛАДОСЦЬ УКРАЛІ*

Гады, гады...Было так, ёсць,
Праходзяць у нябыт няспынна.
Укралі нашу маладосць,
Пакінулі нам успаміны.

І хоць мінула шмат гадоў,
Хоць мы і пастарэлі, Валя,
Аднак тых колішніх сяброў
Мы пры сустрэчы пазнавалі.

Калі мы ўспомнілі наш клас,
Зноў сталі вучнямі – здалося.
Так хутка праімчаўся час,
Мінула ўжо і трыццаць восем.

Хто знае, ці ласкавы лёс
Яшчэ сустрэцца нам дазволіць,
Каб зноў ля гайнаўскіх бяроз
У роднай апынуцца школе.

*ПАМІДОРЫ*

*Валянціне Тэрлецкай прысвячаю*

Ах, памідоры, памідоры!
Прыехалі ў пасылцы „Скорым”.
Такая ў сэрцы асалода –
Запахла раптам агародам.

Здалося што трымаю ў жмені
Я сонца летняга прамені,
Як дар зямлі маёй айчыннай
Як сэрца дарагой жанчыны.

Пунсовыя яны, як вусны,
І чырванеюць так спакусна.
Я іх захоўваў бы ўсё дзесьці
І цалаваў іх, каб не есці.

Пакаштаваў – дык як маліна,
Хацеў бы есці іх няспынна.
І быццам я ўжо ў родным Моры...
Ах, памідоры, памідоры!

KAMUNIKAT.org

# ЖАНОЧАЯ ПАСЦЕЛЬ

Та, что послала мне постель.
*Роберт Бёрнс*

Скажу сумленна,
Што жанчына
Заўсёды ложак слаць павінна,
Тут у яе цудоўны дар!
Паспаць у чысценькай пасцелі,
Якую любая пасцеле, -
Найлепшая з юнацкіх мар.
А як смяюцца нашы вочы,
Калі жанчына сцеле ўночы
І песціць у руках пасцель.
Як узбівае аж да столі.
Падушкі белыя міжволі,
Каб мы нурнулі ў гэту бель!
Як задаволена жанчына,
Калі пад коўдрай ці пярынай
Заснеш,
Як маладзенькі бог.
А як любоўна і ласкава
Яна няўзнак яе паправіць,
Нібы яна спаўзае з ног.

Вярнуўшыся ізноў дахаты,
Гляджу на ложак свой памяты,

kamunikat.org

А лягу, і заціхне боль,
Калі прысню, што ў снежнай белі
Духмяна-чысценькай пасцелі
Зноў засынаю, як кароль.

KAMUNIKAT.org

# 5

**-------**

KAMUNIKAT.org

***

> Бацькоў
> дала зямля бацькоў
> Бацькоў
> зямля бацькоў забрала.
> *Р.Барадулін*

Бацькі мае жылі спрадвеку ў вёсцы,
Раслі з зямлі, з яе пладоў жылі.
І працавалі на сваёй палосцы,
Хоць на маленькай – на сваёй зямлі.
І да яе прапісаныя лёсам
Яны ішлі па дзедаўскіх слядах,
Набожныя, маліліся нябёсам
І пах зямлі насілі на руках.
Імкнуліся прыдбаць хоць дзесяціну,
Цягаліся гадамі па судах,
З адною думкай: штось пакінуць сыну,
І даць дачцэ, што-кольвек у пасаг.
Зямля была падтрымкай і багаццем,
Як кісларод была яна бацькам.
І без зямлі тут не было б і працы
Іх спрацаваным стомленым рукам.
Бацькі былі народжаны зямлёю,
Зрасліся з ёю ўсім сваім жыццём.
Зямлю расілі потам і крывёю
І спяць у ёй сваім апошнім сном.

*РОЗДУМ*

Мама век пражыла свой у Моры,
Ды марскіх не ўбачыла хваль.
Пражыла ўсё жыццё мама ў горы,
Гор не ўбачыла мама, на жаль.

Дарагая і крэўная вёска
І хаціны, што збіліся ў рад,
А за імі лугі і палоскі –
Гэта мамін увесь кругагляд.

А калі я матулю наведаў
І на выезд даў нейкі намёк,
Адказала: - Куды я паеду?
Лепей сам ты паездзі, сынок.

Сёння я ўжо вандрую няспынна,
Імкнучыся пазнаць гэты свет.
І выконваю, нібы павіннасць,
Я матулі маёй запавет.

KAMUNIKAT.org

## *ДЗЯЦІНСТВА*

*Вясне жыцця прысвячаю*

Не ведаюць аб гэтым нашы дзеці:
Яны найбольш шчаслівыя на свеце.
У іх вясна цудоўная такая,
Здаецца, ёй канца не будзе, краю.
Не ведаюць, калі ім бестурботна,
Што іх дзяцінства пройдзе беззваротна.
Ім прыйдзецца даведацца пра гэта,
Калі вясну ў жыцці заменіць лета.
І скажуць: як прыгожа нам жылося,
Калі ў жыцці іх будзе толькі восень.

KAMUNIKAT.org

***

Як вогнішча ўначы, жыццё людское:
Спачатку цепліцца іскрынкай кволай.
Агеньчык доўга поўзае змяёю –
І полымем успыхвае вясёлым.

Яно гарыць сабе спакойна потым
І прытухае на вачах лагодна,
Патлее так, скаванае лянотай,
І попелам становіцца халодным.

KAMUNIKAT.org

## *НА ЖАЛЬ, Я ЎЖО НЕ МАЛАДЫ*

> Скажите мне, молодой человек,
> Где тут магазин?
>
> *Прахожы*

Хоць і сказаў, „ты малады”
І мне на вуліцы прахожы,
Я ўжо адчуў свае гады,
І тут ніхто мне не паможа.

Ды я задумаўся тады:
Заплакаць тут мне, засмяяцца,
Ці вось у рот набраць вады,
Што чуў такое, не прызнацца?

Аднак я тут, разбіты ўшчэнт,
Не засмяяўся, не заплакаў.
Быў гэта толькі камплімент,
Няма ў ім вартасці ніякай.

Мне не лягчэй ад гэтых слоў,
Што незнарок сказаў прахожы.
Ніхто не забярэ гадоў,
На шчасце, і дадаць не можа.

## *ЛЕТНІ РАНАК*

Скінуушы покрыва ночы,
Вёска сустрэла світанне.
Прамыўшы расой свае вочы
На сонейку грэецца раннім.

Бяроза расчэсвае косы
Грабеньчыкам хісткага плоту.
Стары журавель з доўгім носам
Стаіць і чакае спякоту.

Над хатай, раскінуўшы рукі,
Спакойна стаіць вяз-старэча.
Плыве па вясковым бруку
Мора кароў і авечак.

У хатах жанчыны-даяркі
Надой ужо цэдзяць багаты.
Дымяць каміны, як цыгаркі,
Што кураць вясковыя хаты.

KAMUNIKAT.org

*НАД МОРАМ*

Цалуе далікатна мора
Пясчаны бераг хваляй пеннай.
Дзятва ад вадзяных прастораў
У незвычайным захапленні.
Пляж расцягнуўся жоўта-белы
Ля гэтай роўнядзі бясконцай.
І разам з перагрэтым целам
Ў хвалях боўтаецца сонца.
Але знікае смех на тварах,
Бы гасне, бліснуўшы, дасвецце:
Маўклівыя, за парай пара,
Ідуць на пляж сляпыя дзеці.
Паселі і перад сабою
Глядзяць патухлымі вачыма.
Як быццам чуюць шум прыбою,
Які разгледзець немагчыма.
За ручкі ўзяўшыся, шнурочкам
Пайшлі ізноў крутою сцежкай.
І ў іхніх невідушчых вочках
Я ўбачыў... весялосць і ўсмешку.
Дзяцей тых напаткала гора,
Іх лёсу нельга перайначыць.
Здалёк прыехалі да мора,
Каб мора гэтага не ўбачыць.

## *МАЯ ТЫ ВОСЕНЬ, НЕ СПЯШЫ*

Прайшла вясна, мінула лета,
Мая ты восень, не спяшы!
Яшчэ ж і песня недапета,
Яшчэ вясна ў маёй душы.

Я ж у гарэнні, не ў знямозе,
Яшчэ ў мяне юначы ўздым.
Я ўсё знаходжуся ў дарозе,
Я ўсё нястомны пілігрым.

Усё яшчэ збіраю вопыт
І пазнаю шырокі свет.
На рубяжы старой Еўропы
Хачу пакінуць сціплы след.

Зашмат зрабіць мне не ўдалося,
Яшчэ ж не выгарэў да дна!
Дык не спяшы, мая ты восень,
Калі ў душы маёй вясна!

KAMUNIKAT.org

*СВІЦІЦЦА ЛЕС МОЙ ЗАЛАТЫ*

Свіціцца лес мой залаты,
Нібыта ў казцы я, здалося.
Пад ногі сцелюцца лісты,
Калі іх пафарбуе восень.

Пераступае мой парог
І застаецца дамаседам.
Шукаю я сваіх дарог –
За мною восень крочыць следам.
Мяне ўжо з восенню, відаць,
Ніхто ў жыцці не раз'яднае.
Калі мне з ёю сябраваць –
Заўжды хай будзе залатая.

KAMUNIKAT.org

## *СТАМІЎСЯ АД ЧЫТАННЯ ЗРОК*

Стаміўся ад чытання зрок,
Ці дапякае адзінота,
Іду ў суседні свой лясок,
Хоць і асенні, без лістоты.

Лес залацісты свой убор,
Як дар, рассыпаў мне пад ногі.
Ды ён жыве, ён не памёр,
Хоць сумны больш і больш убогі.

Ён больш загадкавы цяпер
І больш маўклівы, задуменны.
О лес, у гэты час, павер,
Люблю твой выгляд летуценны.

Такой цішы няма нідзе
І прыгажосці, і суладдзя.
А цішыня не падвядзе,
Прырода вечная не здрадзіць.

ВЯТРАК

За вёскай, у полі, на ўзгорку,
Дзе ўецца гасцінец-бальшак,
Аб долі задумаўся горкай
Стары спарахнелы вятрак.

,,Найбольш адзінокі на свеце,
Аджыў, як відаць, я свой век,
З мяне насміхаецца вецер,
Пакінуў мяне чалавек.

Не рвуцца ў палёт мае крылы,
Іх шуму мне больш не пачуць.
Не хопіць напэўна ім сілы
Каб жорны хоць з месца крануць”.

KAMUNIKAT.org

## АПОШНІ РАМІЗНІК

Паўзе ўгулкі горад ноч чорнаю кошкай,
У зрэнках свіціцца агонь.
Рамізнік стары дрэмле ў вулцы на дрожках,
І дрэмле рамізніцкі конь.

Так мроіцца ім: пасажыраў хоць трошкі
І грошыкаў трошкі ў далонь.
Чакае рамізнік, чакаюць і дрожкі,
Чакае рамізніцкі конь.

А побач машыны снуюцца, як мошкі
І звоняць трамваі: дзынь-дзонь.
Сумуе рамізнік, сумуюць і дрожкі,
Сумуе рамізніцкі конь.

Дадому? І конь не спяшае ні трошкі,
На козлах дзядуля Лявонь.
Апошні рамізнік, апошнія дрожкі,
Апошкі рамізніцкі конь.

KAMUNIKAT.org

## ДАЖЫЦЬ ДА НАСТУПНАГА ВЕКУ

Трывожнае складанае жыццё
Не дазваляе пазнаваць нам свету.
Пяройдзе чалавек у небыццё
І не паспее вывучыць планеты.

Таму ў наступны дваццаць першы век
Бягуць мае нязздзейсненыя мары:
Каб хоць з ракеты гляну ў чалавек
На незнаёмыя Зямлі абшары.

KAMUNIKAT.org

# СЫШОЎШЫСЯ ЎДВАІХ

*Ж. Б. прысвячаю*

Сышоўшыся ўдваіх -
Не хочаш быць найгоршы,
Прыходзіш да жывых –
Не ўспамінай памёршых.

Твой дробненькі намёк –
І можаш нечакана
Балюча незнарок
Крануць жывыя раны.

І прападзе настрой,
Вясёлы і прыўзняты.
І быццам сам не свой
Зноў вернешся дахаты.

Сышоўшыся ўдваіх -
Не хочаш быць найгоршы,
Прыходзіш да жывых –
Не ўспамінай памёршых.

KAMUNIKAT.org

БЯРОЗА І САЛДАТ

У баі бязлітасным граната
Пад бярозай раніла салдата.
Кроў, што не стрымалася ў вене,
Уцягнула спакваля карэнне.

А з галін параненай бярозы
Пацяклі на твар салдата слёзы.
Наталілі нечакана смагу,
З ціхаю падзякай, за адвагу.

KAMUNIKAT.org

БУСЛЫ

> Дзе буслы водзяцца, гром не ўдарыць.
>
> Народная пагаворка

Жыццё мяняецца няспынна,
Не верыць прыказцы народ.
У клуні, у гняздзе бусліным,
Паставілі громаадвод.

І правялі балот асушку,
Як быццам бы буслам на здзек.
З буслямі жабы-весялушкі
Свой аджылі кароткі век.

Стаяць буслы ў нямой журботе,
Цяжка даводзіцца ў жыцці.
Хоць вешайся на громадроце
Або у вырай назусім ляці.

KAMUNIKAT.org

***

Аж кружыцца галава,
Пульсуе мацней кроў у венах:
Так пахне, так пахне трава,
Калі становіцца сенам.

Аж блякне нябёс сінява,
Што тут цішыня вось такая:
Так ціха, так ціха трава
На скошаным лузе ўмірае.

KAMUNIKAT.org

СОЛЬ ЗЯМЛІ

Колькі ж салёнага поту
За цяжкай у полі работай
Бацькам праліць было трэба,
Каб дома быў бохан хлеба.

Таму мо і чэрствая луста,
Як соллю пасыплеш густа,
Халоднай пальеш вадою,
Здавалася смачнай такою.

KAMUNIKAT.org

## КАЛІСЬЦІ БЫЎ ГАСПАДАРОМ

Усё мінула – ні надзей, ні мар!
Усё былое – толькі ва ўспамінах.
Старэча ён, ужо не гаспадар,
Век дажывае ў горадзе, у сына.

Ён вёску ноччу бачыць заўжды ўсне.
Сумуе ўдзень, душой і сэрцам хворы.
Сам у кватэры – быццам у труне,
Паветра не хапае і прасторы.

Калісьці ў вёсцы быў гаспадаром,
Сям'ю меў, поле, луг і добрых коней,
І ганарыўся ён сваім дабром,
Здабытым мазалямі на далонях.

Нічога ўжо не мае сёння ён.
Сын пераняў турботы, абавязкі.
І ў сынавай сям'і на схіле дзён,
Як хлеба, просіць ён – дабра і ласкі.

## ПЫТАННІ БЕЗ АДКАЗУ

Мы часта называем цяжкай мукай
Адказы на шматлікія пытанні,
Што задаюць нам нашы дзеці, ўнукі,
Прытым нягледзячы на ўзрост свой ранні.
Прызнаццца трэба, сапраўды мучэннем
Для нас пытанні, што мы ставім штодзень
Перад сваім уражлівым сумленнем.
На жаль, на іх адказаў не знаходзім.
Вось мне пытанне не дае спакою:
Чаму матулі я пісаў так мала,
Калі яна з вялікаю тугою
Лістоў маіх чакала, выглядала?
Пытанне задаю ўжо раз каторы,
Хачу я, каб і ўсе яго пачулі:
Чаму так рэдка прыязджаў у Мора,
Дзе дажывала век мая матуля?
Пытанне задаю заўсёды з жалем,
Перад сваім сумленнем вінаваты:
Чаму бываў так рэдка ў шпіталі,
Як там ляжаў смяротна хворы тата?
Задаць яшчэ пытанняў можна многа
З агульнай засцярогаю адразу:
Што можа апраўдаць мяне? Нічога.
Пытанні застаюцца без адказу.

## СЯБРОЎ ШУКАЮ БЕЗУПЫННА

Кто себе не ішчет друга,
Самому себе он враг.
Ш.Руставелі

Сябры далёка так, далёка,
А мне так цяжка без сяброў.
Шукаю тут сяброў навокал
Ды ўсё яшчэ іх не знайшоў.

І ўжо, здаецца, перамога,
Сустрэўся друг – ім даражы!
Ды ён пайшоў сваёй дарогай, -
Нібы старонні і чужы.

Не пераможца я, хоць Віктар,
Я – адзінокі чалавек.
І вельмі сумна, што рэліктам
Сяброўства робіцца ў наш век.

KAMUNIKAT.org

## ЧАЛАВЕЧНАСЦЬ

На свеце мы жывём не вечна,
Усе мы госці тут навокал.
Таму павінны чалавечнасць
Мы праяўляць на кожным кроку.

А чалавечнасці так мала,
І воўкам мы глядзім на брата.
Жывём з нахабствам небывалым
І з крывадушнасцю заўзятай.

Мы часта цынікі і клоўны,
Або двудушныя спрытнюгі
І з ротам пустаслоўя поўным
Збіраем лаўры і заслугі.

Жывём без сораму, сумлення,
Свайму не давяраем веку.
Каб чалавечае падзенне
Не асудзіць у чалавеку.

KAMUNIKAT.org

## ДАБРО І ЗЛО

Гавораць пра паэта: „Піша шчыра,
Але навошта смутак у радках?”
Не вінен я, калі заплача ліра:
Кіруе ёю сэрца – не рука.

А. Арыпаў

Дабро і зло заўсёды ходзяць поруч.
Чаго тут больш, каб кінуць на вагу?
Калі я бачу зло – дык проста хворы,
Зла прамаўчаць ніколі не магу.

А зла так многа, аж занадта многа,
Прывыклі людзі іншым зло тварыць.
Дабро, каб атрымала перамогу, -
Наколькі ж лепш было б тады нам жыць.

Каб здзейсніць мог я:
,,Зла ўжо больш не будзе”
(Аб гэтым марыць можна толькі ў снах).
Калі б дабро тварылі толькі людзі,
Тады б і смутку не было ў радках.

KAMUNIKAT.org

АДЗІНОТА

Жанчын у цябе, кажаш, многа,
Значыць, не маеш нікога.
Доказ, што ты адзінокі,
Нават ад шчасця далёкі.
Шчасце людское не ў суме,
Сэрца не любіць тлуму,
Сэрцу трэба нямнога,
Сэрца шукае другога.
Шчасце людское, паверце,
У двух закаханых сэрцах.

KAMUNIKAT.org

ЗМЕНЛІВАЯ, ЯК НАДВОР'Е

Думаў я – пакутваў столькі ж, -
Даў цябе ласкавы лёс,
У вачах тваіх вясёлкі
Зіхацелі, як з нябёс.

Нечакана бачу: зранку
Цяжка ўжо цябе пазнаць.
У вачах тваіх маланкі
Безупынна зіхацяць.

Стала страшна мне, вядома,
Стала грознай ты, павер,
І чакаць, напэўна, грому
Засталося мне цяпер.

KAMUNIKAT.org

## У КЛЕТЦЫ З БЕТОНУ

У хатах з бярвенняў
Лясных, смаляных
Жылі пакаленні
Ў стагоддзях былых.

А ў век наш дваццаты
Спяшаемся мы
З драўлянае хаты
Ў гіганты-дамы.

І птушка з балкона
Глядзіць, як на здзек:
У клетцы з бетону
Жыве чалавек.

KAMUNIKAT.org

ГАНЧАРЫ

Ганчары прыехалі, ганчары!
І так стала весела на двары.
Гладышы купляйце ды збанкі...
І бягуць за возам хлапчукі.
А які ў збанкоў пузатых звон!
Вабіць да сябе вяскоўцаў ён.
Колькі іх, збанкоў і гладышоў,
Панясуць жанкі сабе дамоў!
І пад спрытнай матчынай рукой
Зацурчыць на дне збана сырадой.
Колькі ж выклікаў дзіцячых мар
З гладышамі звонкімі ганчар.

KAMUNIKAT.org

ЖАДАНЫ ГОСЦЬ

Калі ж у наш гасцінны дом
Нам госця прывядуць багі –
Ён любы нам, як вясні гром,-
І залаты, і дарагі.

Ды толькі пару дзён міне,
Не залатых дарэчы, дзён, -
Наш госць паменшае ў цане,
У момант срэбрам стане ён.

Пачне ісці павольней час,
З трывогай лічым мы дзянькі...
Калі ж пакіне ўрэшце нас
Госць, як жалеза, нам цяжкі.

ПАНЯ АНЯ

Прыехала ў вёску
З горада дачуся.
Спытала па-польску:
- Jak się masz, mamusiu?

-Вось якая паня
З дзяўчыны вясковай!
А на гэта Аня:
- Nie chcę waszej mowy!

-Дык чаго ж ты хочаш,
Скажы, калі ласка?
Анечка бармоча:
- Chcę wiejskiej kiełbaski.

KAMUNIKAT.org

## ХАПУНЫ

Ёсць на свеце хапуны,
Што хапаюць да магілы,
Што імкнуцца да вайны,
Каб забраць чужое сілай.

Хапуноў і сярод нас
Заўсягды не бракавала,
Гэта гарлахвацкіх клас,
Ім заўсёды мала, мала.

Хапуны ўсе без душы,
Рвуцца толькі да раскошы,
Ашуканцы, таргашы,
Робяць грошы, грошы, грошы.

Часта чую: - Вершаплёт,
Твая ў творчасці надзея,
Ты бяднееш з году ў год,
Грошыкаў рабіць не ўмееш.



KAMUNIKAT.org

ВОСЕНЬ, ВОСЕНЬ

Іду далінаю між гор,
Праз маляўнічы лес густы.
Пад ногі сцеле мне віхор
Агніста-жоўтыя лісты.

І цешыць вока прыгажосць
І незвычайны каларыт,
Ды вось і суму першы госць –
Лісты збіраюцца ў нябыт.

У тоўстай засені снягоў
Задрэмлюць дрэвы да вясны.
І будуць безупынна зноў
Сніць аб лістоце новай сны.

Шкада, шкада мне вас, лісты.
Збярог бы вас, каб толькі мог...
Не сыпцеся, як дождж густы,
Не трэба лашчыцца да ног.

KAMUNIKAT.org

## ГОРЫ, ГОРЫ

Горы, горы
прадкажыце,
што там
на маёй арбіце?
Што рыхтуюць
мне нябёсы?
І што суджана
мне лёсам?
Што жыццё
мне абяцае?
Можа, славу
прадракае?
Мо пасля
майго сканання
нат не будзе
ўспамінанняў?
Ды стаяць
маўкліва горы.
Гора, гора...

KAMUNIKAT.org

ЯДНАННЕ З ПРЫРОДАЙ

У старэнькай калысцы,
З надмагільных карэнняў
Вырастала калісьці
Не адно пакаленне.

Пакаленні ўміралі,
Хто старым, а хто юным,
З прахаў іх выраслалі
Зноў калыскі і труны.

KAMUNIKAT.org

## ГАДЗІННІК АРЛОВА

Пакуль ён ходзіць – я жыву.
С. Арлоў

Зазнаў ваеннае дарогі
Танкіст-паэт Сяргей Арлоў.
Пасля вялікай Перамогі
Прыйшоў паранены дамоў.

Застаўся ён з апёкаў следам,
Ад франтавых лячыўся ран.
Ад маці атрымаў „Пабеду”,
Гадзіннік – нібы талісман.

Бярог ён надта ж свой гадзіннік,
Як мір, як неба сіняву.
І паўтараў усім няспынна:
Пакуль ідзе ён – я жыву.

І сапраўды, ён, сэрцам хворы,
Упаў, як у ваенны год.
І хвіляй тою ў калідоры
Спыніў гадзіннік верны ход.

Якое ж супадзенне гэта
І паэтычнае чуццё.
Гадзіннік адмяраў паэту
Яго ахвярнае жыццё.

## СВЯТЫНЯ НАША І БАГАЦЦЕ

З палёгкаю ў лясныя нетры
Мы едзем з душных гарадоў,
Да чыстага яшчэ паветра,
Што з пахам ягад і грыбоў.

Ды гэты ж лес сячэм на дровы,
Паперу, мэблю і дамы.
А потым пра лясоў ахову
Друкуем тоўстыя тамы.

Лес, пішам, - нашае багацце,
Святыня наша, прыгажосць,
Ды неразумна лес той трацім,
Сячэм, нібы сабе на злосць.

Нат і ў апошнюю хвіліну,
На грані вечнага ўжо сну,
Ссякаюць нам на дамавіну
Найпрыгажэйшую сасну.

KAMUNIKAT.org

## НА ЎЛАСНЫ ЮБІЛЕЙ

Нам часам робяць юбілеі
І лічаць нашыя гады,
А юбіляр жыве надзеяй,
Што ўсё яшчэ ён малады.

Што ў творчым ён яшчэ гарэнні,
Што ў сэрцы весні непакой,
Як дрэва, запусціў карэнне
І лісце апрануў вясной.

Што не вядзе яшчэ падлікаў
Здзяйсненням пройдзеных гадоў,
І хто б куды яго не клікаў
Ідзе, пакуль не стыне кроў.

Хоць лічаць нам у юбілеі
Гады, што мчаць у небыццё,
Мы не старэем, мы сталеем
І ўдасканальваем жыццё.



KAMUNIKAT.org

## *НАЙЛЕПШЫ ТЫ, КАЛІ МАЎЧЫШ*

Калі маўчаў ты цэлымі гадамі,
Нічога не пісаў, не друкаваў,
Тады з усімі ў згодзе быў сябрамі.
Ніхто цябе не лаяў, не ўшчуваў.

Калі здзівіў усіх уздымам новым,
Дык добрым быць ты сілішся дарма.
Цябе ўжо лаюць: пішаш бесталкова
І сараму ў цябе зусім няма.

Падобным трэба быць да чарапахі
І панцыр на сваёй спіне насіць.
Тады ў цябе зусім не будзе страху,
Што раптам нехта зможа наступіць.

Калі ж ты не напішаш ані слоўца
І будзеш паслухмяны век, глядзіш,
Цябе ізноў пагладзяць па галоўцы.
Найлепшы ты – тады, калі маўчыш.

KAMUNIKAT.org

## *КУДЫ, КУДЫ БЯГУЦЬ ГАДЫ*

Куды, куды бягуць гады?
Чаму няма гадам звароту?
І хто сцірае іх сляды
У сцюжах, лужах і сумётах?

Хто беліць валасы, як лён?
Барознамі нам твар калечыць?
Хто на адхоне нашых дзён
Знішчае зрок і горбіць плечы?

Хто забірае ў нас бацькоў –
Хто нас найбольш у свеце любіць,
А потым па чарзе ізноў
І нас саміх таксама губіць?

Гады, крадуць усё гады,
Без нашай згоды, запытання.
Бяруць, бягуць і ўсё туды,
Адкуль ужо няма вяртання.

## *ГЕВАНТ*

Ля Геванта жыву я,
Ля Геванта зімую,
І ён мяне заўсёды так палоніць.
І мне здаецца, быццам
Спіць невядомы рыцар
На неба затуманенага фоне.
Штодзень брыду няспынна
Я Белага далінай,
Спыняю крок ля самага падножжа.
Ці на ўваход ёсць шансы?
Зіма лядовы панцыр
Накінула на рыцара вяльможу.
Аднак ізноў вясною
На рыцара без зброі
Накінуцца нахабныя турысты.
Патопчуць беспардонна,
І ён, безабаронны,
Пад крыжам шэптам скажа:
Jezu Chryste.

KAMUNIKAT.org

# 5

-------

KAMUNIKAT.org

*НЕЧАКАНАСЦЬ*

Падумаць толькі, што за свята,
І радасць – не хапае слоў!
Бо беларускіх я дзяўчатак
Тут у Маскве сустрэў ізноў.

Два месяцы ўжо неўзабаве,
Як я пакінуў родны кут.
І як на вуліцы ў Варшаве,
З дзяўчатамі сустрэўся тут.

І гутарку на мове роднай
Так, як заўсёды, павялі,
Ды так пачуліся свабодна,
Як бы мы тут даўно жылі.

Прыйшоўшы да самотнай хаты,
Я не гляджу журботна ў кут,
Бо сэрцу блізкія дзяўчаты
Жывуць амаль што побач тут.

## *МЯНЕ ПАКЛІКАЛА ДАРОГА*

Мяне паклікала дарога,
Хоць і не тыя сталі крокі.
Ды ад бацькаўскага парога
Я так далёка, так далёка.

Што ж, лёс усюды нас кідае,
Мы то ў цясніне, то на строме.
І тужым мы па родным краі
І па бацькоўскім тужым доме.

Тугі не можам мы пазбыцца
І сваёй горкай адзіноты.
Начамі нам Радзіма сніцца,
Яе жыццё, яе турботы.

Мяняем месцы часта, многа,
Мы пералётныя, як гусі.
Ды да бацькоўскага парога
Я зноў вярнуся, зноў вярнуся.

KAMUNIKAT.org

## *БЫВАЙ, МАСКВА*

Лёс мяне на год зрадніў з табою,
Ты была мне блізкай, дарагой.
Ты ўжо стала і маёй Масквою,
Як я стаў часцінкаю тваёй.

Той часцінкай у людскім патоку,
Што бурліць так цэлы дзень кругом.
Будзеш ты, Масква, ізноў далёка,
Як далёка быў мой родны дом.

Я і ў творчым быў тут часта ўздыме,
А адначасова і ў журбе.
Тут тужыў заўсёды па радзіме,
Дома затужу я па табе.

Пабягуць зноў да цябе ўспаміны,
Калі я вярнуся ў родны край.
Дык чакайце, родныя мясціны,
Дык бывай, Масква мая, бывай!

KAMUNIKAT.org

## *ДВА МОРЫ*

Два моры даў ласкавы лёс, два моры,
І з імі я зрадніўся назаўсёды.
Калі не бачу іх – дык проста хворы,
Прыстанішчы яны мне, асалода.

Зялёнае ты Мора маладосці,
Што ў засені садоў стаіш духмяным!
Хоць рэдкім я ў цябе бываю госцем,
Жывеш ты ў маім сэрцы пастаянна.

Гасціннае балгарскае ўзбярэжжа,
Прастора неабдымная, натхненне!
Які ж прывабны гэты подых свежы,
Як прыгажосці многа ў хвалях з пенай.

Калі на Чорным моры сваю стому
Губляю я на працы і турботах,
Дзяцінства Мора мроіцца, вядома,
Туды імкнуся думкамі з ахвотай.

А на Бургаскай вуліцы ў Варшаве
Я мару аб бургаскім узбярэжжы.
Аб Чорным моры, цёплым і ласкавым,
І аб тым Моры, што пад Белавежай.

*ЧОРНАЕ МОРА*

Стагнала ноччу цяжка мора,
Бераг глытаючы пясчаны.
Марскую ўтаймаваў прастору
Лагодны вераснёвы ранак.

Сонца бліскучыя прамені
Сыпнула ў мора, як каралі.
Стаяў я ў дзіўным захапленні
Ад хараства жамчужных хваляў.

Колькі ж чароўнай прыгажосці
Стыхія ўтойвае марская!
Шкада, што я тут толькі госцем...
Мяне дарога ўжо чакае.

KAMUNIKAT.org

## *ТРЫ СТЫХІІ*

Песціць мора жаночае цела.
Жанчына і мора – дзве стыхіі.
Белае цела ў пене белай,
Цалуюць жанчыну хвалі марскія.

Але надакучыла ёй пяшчота:
Выплыла з мора постаць русалкі,
Каб, першага промня адчуўшы дотык,
Абдымкам сонца аддацца цалкам.

Будзе ляжаць яна анямела,
,,Досыць!” – не скажа яму ніколі,
І сонца кроплі сцалуе з цела,
Што раптам страціць свой белы колер.

Ляжаў я побач з думкай такою:
Часам быць морам, сонцам мы хочам
Ці той, прынамсі кропляй марскою,
Што на прыгожым целе жаночым.

*РАЗВІТТАННЕ З МОРАМ*

Мужчыны згорбленыя плечы,
Жанчыны побач дзве старыя,
Стаяць, талкуюць тут аб нечым,
А мора – грозная стыхія.

І нехта (як тут здагадацца?)
Сказаў: старыя, як малыя,
Прыйшлі, каб з морам развітацца,
А мора – грозная стыхія.

Рукой узяўшыся пад пахі,
Яны, старыя і слабыя,
Ідуць у мора (не без страху?),
А мора – грозная стыхія.

Праз нейкі час я ледзь прыкмеціў
Тры галавы зусім сівыя,
Старэнькія –
малыя дзеці,
А мора – грозная стыхія.

Чакаў я доўга, покуль зноўку
Не выйшлі з мора,
ледзь жывыя,
Мужчына і яго сяброўкі,
А мора – грозная стыхія.

Сядзеў я доўга з сумным тварам...
Вось супярэчнасці якія:
Сыходзяцца людская старасць
І мора – грозная стыхія.

## МАЕ ВЕРШЫ

У маіх вершах – сэрца насцеж,
Праўдзівасць пройдзенага, дум.
У маіх вершах – маё шчасце
І ўперамежку боль і сум.

У маіх вершах – мае слёзы
Ад шчасця, ад трывог, бяды,
Бо раз на возе, раз пад возам
Мае імчаліся гады.

Бурліць у вершах безупынна
Мая гарачая любоў
І да народа, да айчыны,
І да бацькоў, і да сяброў.

У мае вершы пераліта,
Як кроў у вены, пачуццё,
Усё, што мною пражыта, -
Усё – усё маё жыццё.

KAMUNIKAT.org

## З М Е С Т

Я. М і к л а ш э ў с к і. Маленькая Айчына – 5.
*Мая зялёная Зубровія – 8.*

**1**

Беларусь – 10. Мінск – 11. Максім Багдановіч – 12. На радзіме Дуніна-Марцінкевіча – 13. Раскажы нам, лес дрымучы – 14. Кастусю Каліноўскаму – 15. Асіміляцыя – 16. Дрэва краіны – 17. Я нарадзіўся беларусам – 18. ,,Праўду горкую, як свой пратэст...” – 20. Памяці Алеся Гаруна – 21. Беларус – 22. Ляці, мая песня – 24.

**2**

Родны кут – 26. Дзяцінства прыстань – 27. Бацькоўскі парог – 28. Сцежкі жыцця – 30. Падляшша – 31. Мая маленькая Айчына – 32. Мая мова – 33. Мая зямля – 34. Мой народ – 35. Сню цябе я, вёска Мора – 36. ,,Кіруеш аслабалы зрок...”- 38. Сушаныя грушы – 39. Палявыя дарогі – 40. Падлетак- 41. Апусцелая вёска – 42. Поўна хата экспанатаў – 43. ,,Была зямля і добры дом...” – 44. Сталёвыя коні - 45. Скажу, бывала: еду да бацькоў – 46. Хлеб – 47. Падзяка – 48. Дзве маткі – 49. Скрыня – 50. Так мала слаў лістоў дахаты – 52. Водаправод – 53. Паўстанак Мора – 54. Пасталы – 55. Першыя боты – 56. Замовы – 57. Некаторым інтэлігентам – 59. І сэрцаў іх апошняе біццё – 60. Я беларус –61. Родная мова – 62. ,,Прывабнасць кожнай кветкі-праскі...” - 63. Дзесяць запаведзяў – 64. Слова ты, роднае слова - 65. Мова,

веру ў тваю неўміручасць – 66. Як жыць без веры, без надзеі – 67. Пагоня – 68. Заўжды гатоў – 69. Вярнуся – 70.

**3**

Беласток – 72. З падарожжа – 73. У цягніку – 74. Я непатрэбны тут нікому – 75. Належны ранг – 76. Мы – згуртаваныя – 78. Гады маланкава праходзяць – 80. Зярняты роднай мова сеем – 81. Юбілейнае – 82. Песня, ты – радасць і надзея – 83. Наш настаўнік – 84.

**4**

Сямейнае шчасце – 86. Прыйдзі, доўгачаканая любоў – 87. Ты недзе ёсць – 88. ,,Ад сэрца да сэрца шлях далёкі...” – 89. Санет – 90. Трыялеты – 91. ,,Сцяжыны той мне не забыць ніколі...” - 92. Ты пазвані ізноў мне, пазвані – 93. Букет гваздзікоў – 94. Дазволь цябе кахаць – 96. Суніцы – 97. ,,Па леце лодак строй смуткуе...” – 98. Зоркі – 99. Першы снег - 100. Гады ў нас маладосць укралі – 101. Памідоры – 102. Жаночая пасцель – 103.

**5**

,,Бацькі мае жылі спрадвеку ў вёсцы...” – 106. Роздум – 107. Дзяцінства – 108. „Як вогнішча ўначы жыццё людское...” – 109. На жаль, я ўжо не малады – 110. Летні ранак – 111. Над морам – 112. Мая ты восень, не спяшы – 113. Свіціцца лес мой залаты – 114. Стаміўся ад чытання зрок – 115. Вятрак – 116. Апошні рамізнік – 117. Дажыць да наступнага веку – 118. Сышоўшыся ўдваіх... 119. Бяроза і салдат – 120. Буслы – 121. „Аж кружыцца галава ...”- 122. Соль зямлі – 123. Калісьці

быў гаспадаром – 124. Пытанні без адказу – 125. Сяброў шукаю безупынна – 126. Чалавечнасць – 127. Дабро і зло – 128. Адзінота – 129. Зменлівая, як надвор'е – 130. У клетцы з бетону – 131. Ганчары – 132. Жаданы госць – 133. Паня Аня – 134. Хапуны – 135. Восень, восень – 136. Горы, горы – 137. Яднанне з прыродай – 138. Гадзіннік Арлова – 139. Святыня наша і багацце – 140. На ўласны юбілей – 141. Найлепшы ты, калі маўчыш – 142. Куды, куды бягуць гады? - 143. Гевант – 144.

**6**

Нечаканасць – 146. Мяне паклікала дарога – 147. Бывай, Масква – 148 . Два моры – 149. Чорнае мора – 150. Тры стыхіі – 151. Развітанне з морам – 152. Мае вершы – 154.

KAMUNIKAT.org

Литературно-художественное издание

*Швед Виктор Никитнч*

*МОЯ ЗЕЛЕНАЯ ЗУБРОВИЯ*

Стихи

Минск, издательство „Мастацкая літаратура”
На белорусском языке

Літаратурна-мастацкае выданне

*Швед Віктар Мікітавіч*

*МАЯ ЗЯЛЁНАЯ ЗУБРОВІЯ*

Вершы

Рэдактар Хв. Д. Жыцка
Мастак А.І. Аблажэй
Мастацкі рэдактар А.М. Малышава
Тэхнічны рэдактар Т.М. Сокал
Карэктар Л.П. Бялова

І.Б. № 3273

Здадзена ў набор 14.09.89. Падп. да друку 09.01.90. АТ 01506. фармат 60x90. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 5,00. Ум. фарб. –адб. 5,19. Ул. – выд. арк. 3.65. Тыраж 1800 экз.Зак. 2920. Цана 40 к.

Выдавецтва ,,Мастацкая літаратура Дзяржаўнага камітэта БССР па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграф камбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная 23.

**Швед В.**

Ш34 Мая зялёная Зубровія: Вершы.. – Мн.: Маст. літ., 1990. – 157 с.: іл.

ISBN 5-340-00478-3

Швед В. Моя зеленая Зубровия: Стихи.

Віктар Швед жыве ў Польшчы, піша па-беларуску.

У сваіх вершах ён праслаўляе родны кут – вёску Мора на Беласточчыне, яе працалюбівых людзей.

Ёсць у зборніку і вершы, прысвечаныя Савецкай Беларусі, а таксама вершы на гістарычныя тэмы.

KAMUNIKAT.org